Сямейная газета



Золата нашай нацыі



«Крылы анёлаў»: каб паверыць у сябе



Кітайскія паэты — па-беларуску

СТАР. 13

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Ірына СТАРАВОЙТАВА, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Якой мы выхаваем моладзь — ад таго будзе залежаць заўтрашні дзень нашай дзяржавы. Важна ёй не толькі гаварыць пра тое, што трэба любіць Радзіму, а каб маладыя людзі былі самі актыўнымі ўдзельнікамі ва ўсіх працэсах, якія адбываюцца ў краіне, і кожны з іх мог зрабіць нешта карыснае для грамадства. Важна, каб яны даследавалі, вывучалі жыццё сваякоў, сваіх продкаў, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне і працавалі над аднаўленнем краіны ў пасляваенны няпросты час, і праз гэта таксама прыходзілі да разумення цаны подзвігу беларускага народа».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8855 | ▼ |
| Еўра | 2,0520 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0324 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0712 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

17087>

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 МАЯ 2017 г. ЧАЦВЕР № 87 (28451)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# З сонейкам — па жыцці



Фота БЕЛТА.

Маладая сям'я Аляксандра і Кацярыны МІГАЛЯЎ з Гомеля.

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# Дэсант на верталёце

## Карэспандэнты «Звязды» ўзялі ўдзел у вучэннях МНС

**У пяціпавярховым доме прагрымеў моцны выбух, прычынай якога стаў бытавы газ. Абрынуўся адзін з пад'ездаў, узнік пажар. Пад заваламі — некалькі людзей. Тыя, каму пашчасціла аказацца на верхніх паверхах, выбеглі на дах і прасілі аб дапамозе. На месца падзей выехалі чатыры аўтамабілі ратаўнікоў, сярод якіх быў кінолаг. Пацярпелых аператыўна дасталі з-пад завалаў і разам з заблакіраванымі на верхніх паверхах эвакуіравалі на верталёце...**

А праз некалькі хвілін з рэек сышла чыгуначная цыстэрна. Больш таго, яна часткова разбурылася, а з пашкоджанай ёмістасці пачаў выцякаць небяспечны рэагент. Тут жа да месца катастрофы прыбыло некалькі аўтамабіляў МНС, сярод іх была машына радыяцыйна-хімічнай абароны і цыстэрны. Месца здарэння тут жа было лакалізавана, а рэагент пачаў адпампоўвацца ў адмысловую ёмістасць. Ліквідаваць наступствы аварыі высадзіўся з верталёта Мі-8 дэсант ратаўнікоў...

СТАР. 4



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Арэнда жылля

# ШУКАЮ ТАННЕЙШЫ ПАКОЙЧЫК

## Спецыялісты прагназуюць актывізацыю рынку здымнага жылля ў сталіцы толькі з трэцяй дэкады мая

**Сёлетняя вясна на другасным рынку прыватнай арэнды пакуль не стала спрыяльным сезонам для кватэраздатчыкаў. Мінулая зіма ўвогуле была складаным перыядам для ўласнікаў свабоднага жылля, бо колькасць кліентаў у гэты час не павялічылася, заробкі ў патэцыйных кватарантаў не падраслі, а вось тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі пайшлі ўгору.**

**Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на найбліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» расказала начальнік аддзела арэнды агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Маргарыта ПАЧЫЦКАЯ.**

### ПОПЫТ БУДЗЕ РАСЦІ

Нагадаю, што за апошнія два гады цэны за арэнду стандартнага жылля ў Мінску зваліліся амаль у разы. Так, калі вясной 2015-га звычайныя аднапакаёвыя кватэры прапаноўваліся ў самым лепшым выпадку (для кватарантаў) за 300 долараў, то сёння падобнае жыллё здаецца не даражэй чым за 160—180 «баксаў». Больш таго, цэны на арэнду зімой і нават у першыя месяцы вясны толькі зніжаліся. Сітуацыя можа змяніцца ў апошнія дні мая, калі арэнднымі кватэрамі Мінска пачнуць больш актыўна цікавіцца будучыя абітурыенты розных навучальных устаноў сталіцы, а таксама іх бацькі. Спецыялісты прыватнага рынку арэнды менавіта ў першыя дні лета чакаюць невялікую хвалю іншагародніх маладых спецыялістаў, якія вырашылі застацца працаваць у Мінску.

СТАР. 4